№ 8 жнівень 2011 г.

*О, Беларусь, мая шыпшына,*
*Зялёны ліст, чырвоны цвет!*
*У ветры дзікім не загінеш,*
*Чарнобылем не зарасцеш.*
***Ул. Дубоўка***

# Шыпшына

***Бюлетэнь Пастаўскай раённай арганізацыі***
***Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны***

***"Хто згубіў сваіх продкаў – сябе губляе,***
***Хто згубіў сваю мову – усё згубіў..."***

***Уладзімір Караткевіч***










## *СЁННЯ Ў НУМАРЫ:*

**с. 2. - Прапановы Пастаўскай раённай арганізацыі ТБМ па пашырэнні ўжывання беларускай мовы на Пастаўшчыне**

**с. 3. - Нашы навіны пра беларускія справы**

**с. 4. Мядовы Спас у Рымках у артыкуле Ігара Пракаповіча**

**с. 5-6. - Знікаючая вёска Манеўшчына ў артыкуле Мікалая Арэха**

**с. 7. - Песні нашых бабуль**

**с. 8. - Легенда пра капялюшнікаў з-пад Гуты з куфра «Легенды і паданні нашага краю» ў літаратурнай апрацоўцы Іны Касарэўскай**

## ПРАПАНОВЫ
## ПАСТАЎСКАЙ РАЁННАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ТБМ ПА ПАШЫРЭННІ ЎЖЫВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ПАСТАЎСКАГА РАЁНА

Па ініцыятыве Пастаўскай раённай арганізацыі ТБМ 3 жніўня адбылася сустрэча актывістаў таварыства І. М. Пракаповіча і Л. Ф. Сяменас са старшынёй Пастаўскага райвыканкама В. С. Гутаравым. Кіраўніку раёна былі перададзены прапановы па пашырэнні ўжывання беларускай мовы на Пастаўшчыне. У часе гутаркі, якая прайшла ў дабразычлівай атмасферы, яе ўдзельнікі пагадзіліся з тым, што стан мовы ў нашай мясцовасці вельмі трывожны і трэба рабіць сумесныя захады дзеля таго, каб такую сітуацыю выправіць. Як запэўніў Віктар Сяргеевіч, да верасня прапановы ТБМ будуць разгледжаны і па іх будуць прынятыя канкрэтныя рашэнні.

### ПРАПАНОВЫ
### Пастаўскай раённай арганізацыі ГА «Таварыства Беларускай Мовы імя Францішка Скарыны»

Улічваючы тое,
што беларусы з’яўляюцца тытульнай нацыяй у краіне Беларусь,
што беларусы складаюць абсалютную большасць насельніцтва Пастаўскага раёна,
што мовай беларусаў з’яўляецца дзяржаўная беларуская мова,
што мова з’яўляецца не толькі сродкам камунікацыі, але і асновай духоўнай культуры,
што дзяржаўныя органы ўлады абавязаны клапаціцца, падтрымліваць і пашыраць сферы распаўсюджвання дзяржаўнай мовы,

Пастаўская раённая арганізацыя ГА «Таварыства Беларускай Мовы імя Францішка Скарыны» звяртаецца ў Пастаўскаі раённы выканаўчы камітэт з прапановамі па пашырэнні ўжывання беларускай мовы на тэрыторыі Пастаўскага раёна.

ПРАПАНОВЫ:

1. Пашырыць аб’ём трансляцыі беларускамоўных праграм у перадачах раённага тэлебачання. Разгледзець магчымасць прадстаўлення эфірнага часу для ТБМ.
2. Стварыць беларускамоўную версію афіцыйнага сайта Пастаўскага раённага выканаўчага камітэта.
3. Увесці на грамадскім транспарце абвяшчэнне прыпынкаў па-беларуску. Разгледзіць магчымасці размяшчэння ў грамадскім транспарце дадатковай беларускамоўнай гукавой і візуальнай інфармацыі.
4. Стварыць тапанімічную камісію для разгляду магчымасці і мэтазгоднасці вяртання гістарычных назваў вуліцам Паставаў, Варапаева, Лынтупаў, а таксама правільнасці ўжывання назваў вёсак, вуліц, шыльдаў крам і іншай публічнай візуальнай інфармацыі.
5. Рэкамендаваць кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый усіх форм уласнасці ствараць рэкламную прадукцыю (шыльды, лагатыпы, буклеты, транспаранты, візітоўкі і іншае) пераважна на беларускай мове.
6. Пры правядзенні афіцыйных сходаў і культурна-масавых мерапрыемстваў аддаваць перавагу беларускамоўным сцэнарыям і тэкстам выступленняў па-беларуску.
7. Стварыць сістэму маральнай і матэрыяльнай падтрымкі беларускамоўных творцаў раёна, спрыяць арганізацыі і правядзенню аўтарскіх вечарын, аўтарскіх канцэртаў, выстаў, выданню буклетаў, кніг, дыскаў, рэалізацыі іншых творчых праектаў.
8. Заснаваць раённую прэмію імя Уладзіміра Дубоўкі для прадпрыемстваў, установ

і фізічных асоб за дасягненні ў папулярызацыі і распаўсюджванні беларускай мовы.

9. Арганізаваць правядзенне традыцыйнага штогадовага культурніцка-літаратурнага фэсту ў дзень нараджэння У. Дубоўкі (15 ліпеня), уключыўшы ў яго праграму навукова-краязнаўчую канферэнцыю "Дубоўкавы чытанні", свята беларускай кнігі, беларускія вечарыны і беларускія дыскатэкі.
10. Правесці ўрачыстасці з нагоды 120-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча (9 снежня) (конкурс на лепшы літартурны твор, прысвечаны М. Багдановічу, конкурс чытальнікаў вершаў М. Багдановіча, запіс фанаграм песень мясцовых выканаўцаў на словы М. Багдановіча, правядзенне літаратурнай вечарыны, папулярызацыя твораў М. Багдановіча ў грамадскім транспарце, на мясцовым радыё і тэлебачанні).
11. Дазволіць правядзенне акцыі раённай арганізацыі ТБМ – велапрабег па вуліцах горада Паставы пад лозунгам "Размаўляй па-беларуску".

Пастаўская раённая арганізацыя ГА «Таварыства Беларускай Мовы імя Францішка Скарыны» гатова прыняць удзел у ва ўсіх мерапрыемствах, якія ставяць мэтай пашырэнне ўжывання беларускай мовы.

---

## НАШЫ НАВІНЫ

Пастаўская раённая арганізацыя ТБМ выдала адмысловы блакнот з выявай гербу таварыства і надпісам "Паставы" кірыліцай і лацінкай. Малюнак на вокладцы стварыў вядомы мясцовы мастак Іосіф Атрахімовіч. Дызайн блакнота і друк забяспечылі спецыялісты Пастаўскай друкарні.




***

Часопіс "Бярозка" і РВУ "Літаратура і мастацтва" абвясцілі літаратурны конкурс для юных аўтараў. Узрост удзельнікаў – ад 12 да 18 гадоў. Творы на беларускай мове будуць разглядацца ў двух намінацыях "Паэзія" і "Проза". Любы малады чалавек можа паўдзельнічаць у конкурсе, даслаўшы свае вершы ці апавяданні на адрас "Бярозкі" да 1 красавіка 2012 года. Заснавана таксама прэмія імя Алеся Якімовіча для дарослых, на якую будуць намінавацца лепшыя аўтары часопіса.

***

Напрыканцы жніўня ў Паставах у доме культуры па вуліцы Станкевіча адбылася традыцыйная жнівеньская нарада настаўнікаў. На ёй прысутнічалі педагогі ўсіх школ раёна. На жаль, з трыбуны беларускае слова гучала рэдка. Адметным было, хіба, выступленне настаўніцы беларускай мовы САШ №1 Галіны Іжмайловіч. А вось у Ганцавічах, невялікім раённым цэнтры на поўдні Беларусі, на падобнай нарадзе УСЕ выступоўцы прамаўлялі па-беларуску. Можа з прычыны таго, што рыхталіся да свята беларускага пісьменства? А, можа, проста любяць родную мову?

# МЯДОВЫ СПАС У РЫМКАХ

Рымкі, невялічкая вёсачка на беразе Дзісны, перажывае свае далёка не лепшыя часы. Што і казаць, калі яшчэ параўнальна нядаўна тут кіпела жыццё, звінелі дзіцячыя галасы, круціў жорны вадзяны млын, а на апрацаваных палетках ў працы завіхаліся людзі, то зараз паўсюль цішыня і запусценне. Вокны ў хаце апошніх жыхароў Рымак Пятра і Ганны Яловік забітыя дошкамі, на панадворку падымаецца густая трава, а ў крылах млына, што нядаўна зрабіў гаспадар, насвіствае свае песенькі вецер.





Ціша і спакой тутэйшых мясцін парушыліся ў суботу, 13 жніўня, калі з раніцы па дарозе да вёскі пачалі рухацца легкавыя аўтамабілі. Людзі ехалі на сваю Бацькаўшчыну да Храма – царквы Дабравесця прасвятой Багародзіцы, што белым ветразем лунае над зялёным морам закінутых садоў і ўтравелых палеткаў. А паклікала іх сюды вялікае свята – першы Спас, або, як яго яшчэ называюць, Мокры ці Мядовы Спас. Гэта ўрачыстасць, якая ладзіцца штогод з часу заснавання царквы, ёсць не толькі яшчэ адна магчымасць ачысціць душу і напоўніць яе святасцю, але і шанц сустрэцца з блізкімі, сябрамі і знаёмымі, прайсціся па родных дварышчах, наведаць продкаў на могілках і паставіць за іх у храме свечкі.

Многа людзей сабралася на свята. Царква ледзь умясціла ўсіх жадаючых. Іерэй Георгій, настаяцель Варапаеўскай Свята-Уваскрасенскай царквы, здзейсніў чын малога асвячэння вады, якую вернікі потым налівалі ў банкі і бутэлькі, каб узяць з сабой.

Потым адбылася святая Літургія і хрэсны ход, у якім бралі ўдзел пяць святароў і ўсе прысутныя. Гэта было ўрачыстае відовішча, якога даўно тут не бывала.

А перад службай былі сардэчныя сустрэчы родных і знаёмых. Людзі віталіся, абдымаліся, некаторыя плакалі ад радасці, што ўдалося ўбачыцца з тымі, каго не бачылі "сто гадоў". Мужчыны і жанчыны збіраліся купкамі, размаўлялі, успамінаючы дзяцінства і юнацтва. Жыва абмяркоўвалася чутка пра тое, што полацкія царкоўныя ўлады збіраюцца правесці рэстаўрацыю храма.

Але як адрадзіць вёску? Гэта пытанне, здавалася, яшчэ доўга плыло ў паветры, калі легкавыя аўто адно за адным ад'язджалі ад храма, пакідаючы царкву, пустыя хаты, здзічэлыя сады, могілкі і раку Дзісну ва ўладзе цішыні і нерухомасці…

*Ігар Пракаповіч*

*З ГІСТОРЫІ ЗНІКЛЫХ ВЁСАК*

# МАНЕЎШЧЫНА

Пакінутая вёска Манеўшчына размяшчаецца за два кіламетры на паўднёвы ўсход ад вёскі Гута, за чатыры кіламетры ад Варапаева. Месца, дзе яна знаходзіцца, даволі прыгожае: маляўнічыя берагі ракі Заражанкі, ялова-хваёвы лес, сухія пясчаныя глебы. Ёсць крыніца, а за кіламетр на поўнач ляжыць возера Задняе.

Прыблізна ў 1850-я гады ў Манеўшчыне пасяліліся дзве сям'і: Дзіковічаў і Балаёў. Іх гаспадары служылі леснікамі. З Балаёў былі Сымон і Алена. Сымон утапіўся і сям'ю збіраліся выселіць, а на іх месца наняць іншага працаздольнага лясніка. Алена ледзь упрасіла графіню Пшаздзецкую іх пакінуць, абяцаючы пані адпрацаваць разам з дзецьмі. Так узнікла гэта паселішча.

Ішоў час. Нараджаліся і паміралі людзі. Ля вёскі з'явіўся могільнік. Аднак з лесу пачаў прыходзіць мядзведзь, які выкопваў труну з памерлым, адцягваў нябожчыкаў у лес і там еў. Могільнік давялося закрыць.

Падзеі Першай сусветнай вайны таксама закранулі вёску. У час Свянцянскага прарыву немцамі лініі фронту, ў жніўні 1915 года ў Манеўшчыне рускія зрабілі ўмацаванні – выкапалі паласу акопаў. Вядома таксама, што былі вырытыя дзве вялікія ямы-сховішчы для коней, якія да сённяшняга дня не захаваліся.

Ёсць звесткі, што за польскім часам ў 1921-1939 гадах мясцовыя жыхары дапамагалі перацягваць праз вёску лодку з ветразем графа Пшаздзецкага, які любіў пакатацца на азёрах Голбія і Задняе. Ён таксама плаваў на каяках (лодках) белага колеру. Там, дзе зараз знаходзіцца кантора Варапаеўскага лясніцтва, была абсталявана прыстань з лаўкамі, якая выходзіла далёка ў возера і на якой граф з графінямі загаралі. Таксама там была драўляная пабудова для пераапранання, у якой меліся люстэркі. А зімой дзеці з Манеўшчыны выходзілі на дарогу Варапаева - Гута паглядзець як граф катаўся ў санях на тройцы коней.

Паміж Майданам і Манеўшчынай стаяла смалярня, якой валодала сям'я яўрэяў. Гаспадара звалі Полек, а яго жонку Эська. У іх працаваў парабакам Катовіч Віктар. Жанчына з Голбіі, Зелянкевіч Анфіса, расказвала, што, пакуль Полек разлічваўся з яе бацькам за карчы, яго жонка, часам, частавала яе булкай. А булкі ў сям'і Анфісы елі толькі па святах.

У 1939 годзе змянілася ўлада. Манеўшчыну закранулі рэпрэсіі. Быў вывезены Гапон Балай, які на пасадзе лесніка мала і пабыў. Патрапіў пад рэпрэсіі і ляснік Яркоўскі з вёскі Маскалева.

Перад вайной у вёсцы было 11 хат: 6 хат размяшчалася з аднаго боку, 5 – з другога. У Манеўшчыне пяць хат належала Балаям, гаспадарамі другіх былі Кучыцы, Ландышкі і іншыя. У сям'і Кучыцаў, напрыклад, было 5 душ, а ў двух хатах Балаёў - па 8.

Пры Польшчы дзеці хадзілі вучыцца ў школу на Гуту. Яна знаходзілася на высокім беразе ручая Амшара. Дзяцей вучылася шмат. Балай Марыі Антонаўне за поспехі ў навучанні нават далі дыплом.

Зямлі ў вёсцы было мала. Частка яе знаходзілася на супрацьлеглым беразе Заражанкі. Маста праз раку не было. На другі бераг быў перакінуты паром, які мог пераправіць 3-4 чалавек, якія мусілі стаяць па калена ў вадзе.

Летам 1941 года пачалася нямецкая акупацыя. У пачатку вайны ў Манеўшчыну зайшлі тры савецкія салдаты, якія адсталі ад сваіх. Пра гэта даведаліся фашысты. Нямецкі афіцэр, забіраючы салдат у Беразвечча, скамандаваў ім па-руску з мацюкамі: "Так вас вучылі ў часці строем хадзіць?" Жыхары вёскі ў той час не пацярпелі.

А восенню 1943 года пачалася карная аперацыя супраць партызан. У

пятніцу, 8 верасня, Марыя Антонаўна пасвіла авечкі каля вёскі. Жыхары ўжо ведалі, што немцы прыедуць у гэты дзень. Манеўшчыну акружылі адначасова і з боку вёскі Харкі, і з боку Гуты.


*Вёска Манеўшчына патанае ў дзікай траве*

Насельніцтва сабралі ў ток, магчыма, хацелі спаліць. Потым немцы знайшлі дакументы Балая Валодзькі, загергаталі па-свойму (як сказала Марыя) і адпусцілі, даўшы паўгадзіны на зборы. Павялі ў бок Варапаева, падганяючы штыкамі. Як падыйшлі да пагурка Дзегцярка, немцы пачалі шугаць агнём з балонаў пад стрэхі хат. Марыя заплакала. А немец, які відаць крыху ведаў польскую мову, даў ёй у карак і сказаў: "Нашто табе гэта хата?". Прывялі ў графскі дом у Варапаеве. Там неяк атрымалася схавацца ў хаце Канюшэўскай, якая жыла каля графскай сядзібы і хадзіла да немцаў на працу. Праз нейкі час Марыя і яе сям'я пакінула гэта месца, пазбегнуўшы вывазу у Германію. Калі ішлі па чыгунцы (каля старых могілак у Варапаеве), натыкнуліся на пяцёх немцаў, якія правяралі наяўнасць мін. Хацелі ўцякаць, але пабаяліся, што немцы будуць страляць. Пайшлі далей. Немцы не зачапілі.

Насельніцтва вёскі пасля спалення падаліся хто-куды. Хто пайшоў жыць у вёску Чорнае, хто на Глыбоччыну (туды пад Канстанцінава немцы адпраўлялі старэйшых), хто ў іншыя месцы. Сям'я Марыі праз тыдзень вярнулася назад у Манеўшчыну, а бацька крыху раней. У 1944 годзе, пасля вызвалення, на фронт з вёскі трапіла 6 чалавек і яшчэ адзін быў

Зэнька Аляксеевіч, Балай Мікалай Антонавіч, Ландышка Мікалай Іосіфавіч, Кучыц Уладзімір Уладзіміравіч.

12 мая 1949 года у вёсцы Харкі узнік калгас, які атрымаў імя Варашылава. У яго склад увайшла і вёска Манеўшчына. На той момант у калгасе працавала 72 чалавекі. Кіраўніком быў выбраны Гарус Нікадзім Іосіфавіч. Частка вяскоўцаў хадзіла працаваць на шклозавод " Гута".

Пасля вайны ў ваколіцах вёскі, у Хабацені, калі капалі фундамент пад кухню, знайшлі чалавечы чэрап. Таксама на могільніку(?) кавалкі знайшлі глінянага посуду таўшчынёй з палец з арнаментам "крыж на крыж".

У пачатку XXI стагоддзя ў Манеўшчыне здарылася трагедыя. У той час у вёсцы засталося некалькі чалавек, з іх два мужчыны. Адзін з іх, Балай Уладзімір, забіў другога, Скур'ята Жоржыка. Аб гэтым здарэнні пісалі ў раённай газеце. З 2004 года ў вёсцы ніхто не жыве. Але Марыя Антонаўна, якая жыве ў Харках, лічыцца жыхаркай вёскі Манеўшчына.

*Мікалай Арэх*
*фота аўтара*

# ПЕСНІ НАШЫХ БАБУЛЬ

## ТУМАН ЯРАМ

Туман ярам, ярам-даліною,
Туман ярам, ярам-даліною.

За туманам нічога не відна,
Толькі відна дуба зелянога.

Пад тым дубам крыніца стаяла,
Там дзяўчына воду набірала.

Ды ўтапіла залато вядзерца,
Засмуціла казакова сэрца.

- А хто ж тое вядзерца дастане,
Той са мною на ручніку стане.

Адазваўся казак маладзенькі:
- А я ж тое вядзерца дастану,

Я з табою на ручніку стану…
… Туман ярам, ярам-даліною..

## ОХ, І СЕЯЛА УЛЬЯНІЦА ЛЯНОК

**Ох і сеяла Ульяніца лянок,**
**Ох і сеяла Іванаўна лянок.**

**Ох, сэрца лянок,**
**Мая радасць ты, лянок,**
**Ўсё бялюсенькі кужалёк!**

**Ох, палола Ульяніца лянок,**
**Ох, палола Іванаўна лянок.**

**Ох, іравала Ульяніца лянок,**
**Ох, ірвала Іванаўна лянок.**

**Ох, і слала Ульяніца лянок,**
**Ох, і слала Іванаўна лянок.**

**Ох, і мяла Ульяніца лянок,**
**Ох, і мяла Іванаўна лянок.**

**Ох, і прала Ульяніца лянок,**
**Ох, і прала Іванаўна лянок.**

**Ох, і ткала Ульяніца лянок,**
**Ох, і ткала Іванаўна лянок.**

**Ох, сэрца лянок,**
**Мая радасць ты, лянок,**
**Ўсё бялюсенькі кужалёк!**

## ОЙ СІВЫ КОНЬ БЯЖЫЦЬ

Ой сівы конь бяжыць
На ім бела грыва
Ой спадабалася
Ой спадабалася
Мне тая дзяўчына

Ня так та дзяўчына
Як яе лічанька
Ой падай дзяўчына
Ой падай дзяўчына
На коня ручаньку

Рукі не падала
Тры словы сказала
Няхай бы я жыла
Няхай бы я жыла
Кахання не знала

Бо тое каханне
Звячора да рання
Як сонейка ўзыйдзе
Як сонейка ўзыйдзе
Каханне разыйдзе

Ой сівы конь бяжыць
На ім бела грыва
Ой спадабалася
Ой спадабалася
Мне тая дзяўчына

# ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ НАШАГА КРАЮ

## КАПЯЛЮШНІКІ

З Чартком і наваколлем гэтай вёскі звязана мноства прыгод і самых неверагодных здарэнняў. Кажуць, неяк аднойчы сабраліся два мужчыны з Чартка на рыбу. Трэба сказаць, была ўжо восень, вада халодная, ды і надвор’е ледзь не на прымарозак бралася. Добра набоўтаўшыся ў Чарцянісе (назва гэта замацавалася за ракой пасля таго, як у яе вусці злавілі дзівосную рыбіну), рыбакі сабралі свой небагаты ўлоў і хацелі ўжо пайсці дадому. Толькі на абодвух навалілася нейкая зморанасць, таму вырашылі крыху адпачыць, перавесці дух. Каб канчаткова не змерзнуць, прымасціліся каля стажка з аеру і позняй асакі. Стажок належаў аднаму з рыбакоў і знаходзіўся якраз недалёка ад ракі. Не паспелі сесці і як мае быць сагрэцца, як убачылі ўдалечыні вогнішча. І хоць да вёскі было недалёка, абодва ўсталі і накіраваліся да агеньчыка, каб сагрэцца і крыху абсохнуць. Пасля ўжо расказвалі яны, што хоць і бачылі святло перад сабой, доўга не маглі патрапіць да вогнішча, шмат разоў паварочвалі то ў адзін, то ў другі бок, бо вогнішча быццам скакала па полі.



Нарэшце, зусім збіўшыся з ног, дабраліся. Аказалася, вогнішча паліў нейкі незнаёмы дзівак у нейкай няскладнай цёмнай вопратцы і вялікім капелюшы, насунутым так нізка, што твару не было відаць. Незнаёмы аказаўся да таго ж і вельмі маўклівым, бо як ні спрабавалі разгаварыць яго — нічога не атрымалася. Рыбакі вырашылі, што не вельмі рады гаспадар бачыць няпрошаных гасцей ды яшчэ забаўляцца з імі. А калі развярнуліся ўжо адыходзіць, за іх спінамі пачуўся спачатку прыглушаны хрып, затым раздаўся нечалавечы рогат і лапатанне птушыных крылаў...

Азірнуліся рыбакі толькі тады, калі дабеглі да першага падворка. Але яшчэ доўга жах ледзяніў іх спіны і ногі. Раніцай мужчыны расказалі пра начное здарэнне, але вяскоўцы паднялі тых на смех. І толькі калі прыйшлі да ракі, убачылі на месцы стажка папялішча.

*Літаратурная апрацоўка і малюнак*
*Іны Касарэўскай*

**Шыпшына**

**Шыпшына**
*Выданне Пастаўскай раённай арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны*

Адказны за нумар: Ігар Пракаповіч

Адрас: 211875, горад Паставы, вул. Паркавая, 52. Тэл.: 02155-4-44-75

Вёрстка: Ігар Пракаповіч

*Рэдакцыя можа не падзяляць думкі аўтараў друкаваных матэрыялаў*

*Надрукавана на абсталяванні сяброў, распаўсюджваецца дарма*

*Наклад 100 асобнікаў*